## ВЫСАКАРОДНАЯ МІСІЯ МУЗЕЯ

**Удзельнікам і гасцям Другога Нацыянальнага форуму «Музеі Беларусі»**

Дарагія сябры!

Сардэчна віншую вас з адкрыццём Другога Нацыянальнага форуму «Музеі Беларусі».

Захаванне і папулярызацыя нацыянальных каштоўнасцяў — высакародная місія музеяў краіны. Кожны з іх штодзень працуе на ніве духоўнага ўзбагачэння беларускага грамадства, фарміравання пачуцця гонару за наша слаўнае гістарычнае мінулае, якое з'яўляецца неад'емнай часткай сусветнай спадчыны.

Неацэнная роля музеяў у справе выхавання гарманічнай і ўсебакова развітой асобы, сапраўднага грамадзяніна рэспублікі. Сёння, калі нам так важна быць разам, значэнне музея як сацыяльна-культурнага інстытута, дзейнасць якога накіравана на падтрымку адзінства народа, асабліва вялікае.

Упэўнены, што ваш форум, які праходзіць пад дэвізам «Музеі і грамадства: ад камунікацыі да ўзаемадзеяння», будзе садзейнічаць пашырэнню прафесійных сувязяў, дасць магчымасць спецыялістам музейнай справы акрэсліць новыя кірункі ў сваёй рабоце і абавязкова ўнясе свой уклад ва ўмацаванне пазітыўнага іміджу нашай краіны.

Жадаю ўдзельнікам і гасцям форуму добрага здароўя, шчасця і творчых поспехаў.

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА.**

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

26 ВЕРАСНЯ 2014 г. ПЯТНІЦА № 183 (27793) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

# ДРУЖБА, ПРАВЕРАНАЯ ЧАСАМ

## Беларусі і Малдове трэба арыентавацца на тавараразварот $1 млрд

**Візіт Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі ў Малдову для эканамічных і палітычных стасункаў дзвюх краін можна лічыць без перабольшвання гістарычна значным.**



Фота БЕЛТА.

З апошняй афіцыйнай сустрэчы прэзідэнтаў нашых дзяржаў прайшло ні многа ні мала 14 гадоў. За гэты час Беларусь стала членам Мытнага саюза і падпісала дагавор аб уваходжанні ў Еўразійскі эканамічны саюз, а Малдова пайшла па шляху асацыяцыі з ЕС. Здавалася б, цяжкасцяў на шляху супрацоўніцтва дзвюх краін хапае. Аднак цяжкасці — гэта зусім не значыць непераадольныя перашкоды, і гэта стала зразумела з першых гадзін знаходжання беларускага Прэзідэнта на малдаўскай зямлі. «Аказваецца, і ў складаных умовах мы можам дамаўляцца», — сказаў Аляксандр Лукашэнка пасля размовы ў фармаце «сам-насам» са сваім калегам Мікалаем Цімофці. «Мы нязменна разглядаем Малдову як надзейнага партнёра, дружалюбную і блізкую нам краіну, развіццё палітычных і эканамічных адносін з якой прыярытэтнае для Беларусі», — падкрэсліў беларускі лідар, падводзячы вынікі перамоў, і гэта стала фактычна лейтматывам усёй надзвычай насычанай праграмы афіцыйнага візіту.

Учора, акрамя сустрэчы са старшынёй парламента Малдовы Ігарам Корманам і лідарамі парламенцкіх фракцый, а таксама прэм'ер-міністрам гэтай краіны Юрыем Лянкэ, Прэзідэнт Беларусі разам з Прэзідэнтам Малдовы ўрачыста адкрылі камерцыйны цэнтр па продажы керамічнай пліткі і санітарнай керамікі беларускага прадпрыемства «Керамін» у Кішынёве. Аляксандр Лукашэнка назваў гэта знакавай падзеяй, якая красамоўна сведчыць аб развіцці дзелавога супрацоўніцтва паміж дзвюма краінамі.

За дзень да гэтага, падчас беларуска-малдаўскага бізнес-форуму, «Керамін» заключыў буйны кантракт на пастаўку сваёй прадукцыі ў Малдову. Кампанія Stadler Minsk як правапераемнік прадпрыемства «Белкамунмаш» падпісала з упраўленнем гарадскога электрычнага транспарту Кішынёва пагадненне аб пастаўках машынакамплектаў і сумеснай вытворчасці тралейбусаў у сталіцы Малдовы да 2018 года, Смаргонскі аўтаагрэгатны завод атрымаў буйны кантракт на пастаўку трактаракамплектаў для прамысловай зборкі садова-вінаградарскіх трактароў у Малдове. Усяго ўдзельнікі бізнес-форуму заключылі кантрактаў на $ 20 мільёнаў. Але гэта толькі першы крок да супрацоўніцтва на поўную моц, лічыць беларускі лідар. Беларусі і Малдове трэба арыентавацца на тавараразварот $1 млрд, заявіў Аляксандр Лукашэнка па выніках перамоў са сваім малдаўскім калегам Мікалаем Цімофці. Перадумовы для гэтага ёсць: з 2000 года аб'ём узаемнага гандлю вырас у пяць разоў і дасягнуў у 2013 годзе адзнакі амаль $360 млн. Паводле слоў Прэзідэнта Беларусі, пэўны задзел зроблены, трэба рухацца далей. Нездарма на праведзеных перамовах прэзідэнты акцэнтавалі ўвагу на развіцці гандлёва-эканамічных адносін паміж дзвюма краінамі.

І арыентацыя на розныя эканамічныя аб'яднанні тут не перашкода, лічыць Аляксандр Лукашэнка. Цяпер беларускі бок, праводзячы перамовы з Малдовай, з улікам абавязацельстваў у Мытным саюзе, з улікам арыенціраў Малдовы на Еўрапейскі саюз, знаходзіць дадатковыя шляхі супрацоўніцтва. Напрыклад, перспектыўным выглядае супрацоўніцтва ў вытворчай кааперацыі і выхадзе з сумеснай прадукцыяй на рынкі трэціх краін і Еўрасаюза. «На сумеснай вытворчасці трактароў і сельскагаспадарчай тэхнікі лакалізуемся, як гэта патрабуецца ў Еўрапейскім саюзе, — гэта значыць, Малдова будзе вырабляць пэўную частку такой тэхнікі, — сертыфікуем яе, будзем прадаваць у ЕС наш сумесны тавар і дзяліць грошы, як гэта звычайна бывае», — адзначыў беларускі лідар.

Кіраўнік беларускай дзяржавы падкрэсліў, што беларускі бок гатовы забяспечыць патрэбы малдаўскіх партнёраў у машынабудаўнічай і нафтахімічнай прадукцыі, таварах лёгкай прамысловасці, будматэрыялах, бытавой тэхніцы, лекавых сродках і прадуктах харчавання. Акрамя таго, Беларусь зацікаўлена ў рэалізацыі праектаў развіцця дарожнай інфраструктуры і сельскай гаспадаркі Малдовы.

СТАР. 2

# СЕЙЛАВІЦКІЯ НОВАБУДОЎЛІ



Фота Аляксандра ШАБЛЮКА.

*У вёсцы Сейлавічы Нясвіжскага раёна добраўпарадкаваннем займаюцца ўсур'ёз. Напрыклад, на месцы закінутых сядзіб пабудавалі два новыя сучасныя катэджы. Цяпер спецыялісты ПМК-23 ААТ «Салігорсквадбуд» праводзяць у іх апрацоўчыя работы і даводзяць да ладу камунікацыі. Прараб Сяргей ПАСІКАЎ і рабочы Юрый ШУСТА ўпэўненыя, што навасёлам у гэтых дамах жыць будзе зручна і ўтульна.*

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Анатоль ТОЗІК, віцэ-прэм'ер:**

***«Не магу сказаць, што сістэма педагагічнай адукацыі ў краіне знаходзіцца ў крызісным стане, але пэўныя тэндэнцыі яе развіцця з'яўляюцца трывожнымі. Сёння 14 устаноў вышэйшай адукацыі рыхтуюць педагогаў. Штогадовы выпуск з іх спецыялістаў складае больш за 7,5 тысячы чалавек, з якіх больш за палову атрымліваюць адукацыю за кошт бюджэтных сродкаў. Тым не менш кожны год ёсць праблемы з камплектаваннем школ асобнымі спецыялістамі. Сярод захадаў па вырашэнні гэтай праблемы прапануецца павялічыць стыпендыі студэнтам педагагічных ВНУ, асабліва на востradэфіцытных спецыяльнасцях, прадугледзець магчымасць атрымання 1-й катэгорыі пасля двух гадоў адпрацоўкі маладым спецыялістам, якія зарэкамендавалі сябе ў педагагічнай прафесіі, устанавіць даплаты для педагогаў, што скончылі магістратуру, устанавіць значныя разавыя выплаты для спецыялістаў, якія адпрацавалі па размеркаванні два гады, у выпадку прадаўжэння з імі працоўных адносін і заключэння кантракта на работу ў гэтай установе адукацыі, а таксама змяніць змест праграм падрыхтоўкі настаўнікаў і вярнуцца да падрыхтоўкі па здвоеных спецыяльнасцях».***

■ Арэнднае жыллё

# ЗДЫМНЫ «КВАДРАТ» СТАНЕ БЛІЖЭЙ



**Праграма па стварэнні арэнднага жылля ў нашай краіне трапіла ў ранг дзяржаўнай палітыкі яшчэ летась. Сёння спецыялісты ўжо цалкам упэўнены, што менавіта гэты прагрэсіўны механізм дасць магчымасць палепшыць свае жыллёвыя ўмовы тым «чаргавікам», у якіх не хапае грошай ці жадання будаваць або купляць жыллё ва ўласнасць. А быць уласнікам стандартнай кватэры ў сучасным свеце і неабавязкова, лічыць начальнік упраўлення жыллёвай палітыкі Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва Беларусі Аляксандр ГОРВАЛЬ.**

### МАБІЛЬНАСЦЬ НАСЕЛЬНІЦТВА Ў МЕЖАХ ДЗЯРЖАВЫ

Спецыяліст адзначыў, што летась у краіне было пабудавана 53,5 тысячы квадратных метраў арэнднага жылля. На гэты год запланавана ўвесці ў эксплуатацыю ўжо 320 тысяч такіх «квадратаў», або 2121 кватэру. Зразумела, што найбольшую патрэбу ў арэндным жыллі мае наша сталіца. Менавіта таму ў Мінску сёлета будзе пабудавана 559 здымных кватэр, у Брэсцкай вобласці — 256, у Віцебскай — 120, у Гомельскай — 391, у Гродзенскай — 428, а ў Мінскай — 215 асобных жыллёвых памяшканняў.

Калі разглядаць арэнду ў перспектыве, то налета ў Беларусі неабходна будзе пабудаваць яшчэ каля 600 тысяч квадратных метраў падобнага жылля. Спецыялісты разлічваюць і надалей нарошчваць гэтыя аб'ёмы, каб дзяржфонд арэндных дамоў стварыў сур'ёзную канкурэнцыю здымным кватэрам на свабодным рынку прыватнага сектара. Каб і там цэннікі арэнды паменшыліся і сталі больш даступнымі.

А пасля гэтага наша моладзь атрымае больш свабоды ў выбары працы і прафесіі, бо краіна будзе мець сапраўды спрыяльныя ўмовы беспрабемнага перамяшчэння працоўных рэсурсаў у межах асобных рэгіёнаў і ўсёй дзяржавы. Праблема жылля для падобнай катэгорыі спецыялістаў проста знікне.

### ДАХОДНЫЯ ДАМЫ АД ПРЫВАТНАГА ІНВЕСТАРА

Разам з тым у Мінбудархітэктуры разлічваюць узводзіць арэндныя дамы не толькі за кошт бюджэтных сродкаў. Цяпер у нас разлічваюць прыцягваць да будаўніцтва арэнднага жылля прыватныя кампаніі, таму зараз і вывучаецца магчымасць прымянення тых схем, якія існуюць у сусветнай практыцы.

Зараз на ўзроўні міністэрства разглядаюцца два асноўныя механізмы. Першы заключаецца ў прадастаўленні інвестару пэўных, даволі сур'ёзных, прэферэнцый ад дзяржавы на этапе будаўніцтва і эксплуатацыі арэнднага жылля. Гэта могуць быць падатковыя льготы, меншыя тарыфы пры падключэнні да камунікацый, выкарыстанні рэсурсаў для абслугоўвання жылога дома і гэтак далей. Тады інвестар можа выйсці на акупнасць свайго праекта і за кошт арэнднай платы для пэўных катэгорый насельніцтва, якую вызначае дзяржава.

Другі механізм прадугледжвае будаўніцтва арэнднага жылля інвестарам па рынкавых прынцыпах без знешняй дапамогі. У гэтым выпадку забудоўшчык зможа вызначаць такую арэндную плату, якая дазволіць яму забяспечыць вяртанне ўкладзеных сродкаў і атрымаць прыбытак. Паводле такога сцэнарыя дзяржава будзе вызначаць катэгорыі грамадзян, якіх неабходна будзе падтрымліваць. Уласнік такіх арэндных дамоў будзе прапаноўваць здымнае жыллё па свабодным кошце, а дзяржава ў індывідуальным парадку, адрасна будзе кампенсаваць арэндныя плацяжы для асобных катэгорый грамадзян і сем'яў.

СТАР. 2

■ Надвор'е

## «ПРЫВІТАННЕ» АД БАЛТЫКІ

### У суботу будуць дажджы

Сёння тэрыторыя нашай краіны застанецца ў зоне павышанага ціску, таму будзе пераважна без ападкаў. Толькі ў Брэсцкай і месцамі па Гродзенскай абласцях чакаюцца кароткачасовыя дажджы, паведаміла рэдакцыі **спецыяліст Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Вольга ФЯДОТАВА.**

Максімальная тэмпература паветра ўдзень складзе плюс 12–18 градусаў. А вось у суботу чарговы атмасферны фронт з боку Балтыйскага мора прынясе да нас кароткачасовыя дажджы на ўсёй тэрыторыі. Раніцай месцамі чакаецца туман. Тэмпература паветра ўначы на суботу складзе 2–8 цяпла, па паўночным захадзе краіны чакаецца нават да 10 цяпла, а па паўднёвым усходзе месцамі магчымы замаразкі да 0 — мінус 3 градусаў. Удзень будзе 12–17 цяпла.

У нядзелю атмасферны ціск будзе павялічвацца, таму чакаецца без ападкаў, аднак месцамі магчымы туман. Уначы на нядзелю прагназуецца 3–9 цяпла, на тарфяніках Палесся слабыя замаразкі да мінус 2 градусаў. Удзень стане плюс 12–18 градусаў. У пачатку наступнага тыдня захаваецца павышаны атмасферны ціск, таму ў панядзелак істотных ападкаў не прадбачыцца. Раніцай паўсюдна туман. Уначы на панядзелак будзе 3–10 цяпла, але на тарфяніках Палесся магчымы замаразкі ў межах ад 0 да мінус 2 градусаў. Удзень будзе плюс 13–18 градусаў, а па Брэсцкай вобласці — да 20 цяпла.

Паводле доўгатэрміновых прагнозаў айчынных спецыялістаў, у сярэдзіне наступнага тыдня тэмпературны фон істотна не павялічыцца. Здаецца, бабіна лета прыйдзе да нас толькі ў кастрычніку. Чакаем.

**Сяргей КУРКАЧ.**

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### Украіна падасць заяўку на ўступленне ў ЕС у 2020 годзе



Пра гэта заявіў прэзідэнт краіны Пётр Парашэнка, перад тым як агучыць праграму пераўтварэнняў краіны, разлічаную да 2020 года. «Стратэгія-2020» прадугледжвае каля 60 рэформаў, якія трэба запускаць амаль адначасова», — заявіў Парашэнка на прэс-канферэнцыі. Паводле слоў прэзідэнта, рэфармаванне мяркуецца пачаць ва ўсіх сферах жыцця грамадства. «Калі мы абмяркоўвалі рэформы, нам раілі не пачынаць рэфармаванне адразу ва ўсіх сферах, але мы будзем рабіць па-іншаму…» — сказаў прэзідэнт. Паводле яго слоў, гэты пакет рэформаў будзе гатовы ўжо да пачатку працы парламента новага склікання. У ліку прыярытэтных задач прэзідэнт назваў антыкарупцыйную рэформу, якая прадугледжвае абнаўленне ўлады, судовую і падатковую рэформы, дэцэнтралізацыю ўлады, дэрэгуляцыю прадпрыемстваў, рэформу МУС, развіццё абароннага комплексу. Паводле слоў прэзідэнта Украіны, плануецца таксама ажыццяўленне праграм па дасягненні энерганезалежнасці дзяржавы і папулярызацыі Украіны ў свеце.

### Туркменскіх чыноўнікаў перасадзілі на белыя «мерседэсы»

У Туркменіі высокапастаўленых чыноўнікаў перасадзілі з чорных службовых «мерседэсаў» на белыя. Пра гэта паведамляюць інфармагенцтвы са спасылкай на крыніцу ва ўрадзе. Службовыя машыны «Mercedes-Benz E 300» белага колеру ўжо атрымалі 160 кіраўнікоў міністэрстваў і розных ведамстваў. Сярод іншых такія аўтамабілі былі прадастаўлены кіраўніцтву туркменскіх СМІ. У перспектыве чыноўнікі абласнога і раённага ўзроўню таксама перасядуць на белыя мадэлі. Прыклад падаў прэзідэнт Туркменіі — апошнім часам кіраўнік рэспублікі і яго эскорт сталі ездзіць на машынах белага колеру. Афіцыйная прычына змены аўтапарка не паведамляецца.

ISSN 1990 - 763X

14183>

9 771990 763008

## ПАДРАБЯЗНАСЦІ

### Спадніца прадкажа верагоднасць раку грудзей

Брытанскія вучоныя прыдумалі новы спосаб вызначыць, наколькі тая ці іншая жанчына схільная да захворвання на рак грудзей. Спецыялісты ўніверсітэцкага каледжа Лондана нагадалі, што паўната павышае рызыку захворвання на рак. Тое, як хутка жанчына набірала вагу, можна высветліць, даведаўшыся, як часта яна мяняла памер спадніцы. За пункт адліку вырашана было браць той памер, які быў у дамы прыкладна ў 25 гадоў. Аказалася, што ў жанчын, якія пасля 25-ці кожнае дзесяцігоддзе куплялі сабе вопратку на памер больш, рызыка атрымаць рак грудзей пасля наступлення менапаўзы была на 33% вышэйшай, чым у іх больш стабільных аднагодак, паведамляе BBC. У тых жа, хто набіраў вагу яшчэ хутчэй і за дзесяць гадоў паспяваў памяняць два памеры, рызыка павышаецца да 77%. Каментуючы вынікі даследавання, спецыялісты адзначылі, што рак малочнай залозы можна прадухіліць, калі змяніць лад жыцця і падтрымліваць сябе ў форме. Жанчынам неабходна асабліва старанна сачыць за сваёй вагой і колькасцю тлушчавых адкладанняў. Асабліва гэта тычыцца таліі — менавіта тут лішнія сантыметры сведчаць аб магчымай рызыцы захворвання.



## КОРАТКА

Расія прадаставіць Беларусі крэдыт у эквіваленце $1 млрд 550 млн, паведамілі ў Міністэрстве фінансаў.

**Вядомы спартсмен, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі па ахове здароўя, фізічнай культуры, сямейнай і маладзёжнай палітыкі Вадзім Дзевятоўскі выбраны ўчора старшынёй Беларускай федэрацыі лёгкай атлетыкі.**

У Беларусі за апошнія 10 гадоў колькасць людзей пажылога ўзросту павялічылася на 74,8 тыс. чалавек, або на 4,2%. На пачатак 2014 года ў рэспубліцы іх пражывала 1 млн 879,9 тыс., што складае 19,9% ад колькасці насельніцтва. Сярод іх жанчын было 1 млн 224,6 тыс. чалавек, мужчын — 655,3 тыс. чалавек.

**Нацыянальны аэрапорт Мінск прыняў двухмільённага пасажыра 2014 года. Ім стаў пасажыр рэйса авіякампаніі «Белавія» з Масквы. «Такі ўражальны вынік у гісторыі авіяпрадпрыемства дасягнуты другі раз запар з савецкіх часоў», — адзначылі спецыялісты.**

Па версіі партала для падарожнікаў Travel.ru, Мінск узначаліў рэйтынг 50 гарадоў Еўропы для паездак на лістападаўскія святы.

■ Я зноў выбіраю «Звязду»

## «ГАЗЕТУ ВЫПІСВАЮ АДРАЗУ НА ПАЎГОДДЗЕ.

### І ВЕЛЬМІ ШКАДУЮ, ШТО НЕ РАБІЛА ГЭТАГА РАНЕЙ»

**Я нарадзілася ў вёсцы, дзе ўсе размаўлялі па-беларуску. Але ж потым, чым болей сталела, чым вышэй падымалася па службовай лесвіцы, тым менш было зносін на беларускай. Руская панавала ў калідорах улады — у тым жа райкаме партыі, у райвыканкаме, дзе давялося працаваць…**

Але вось я сыходжу на пенсію. Усё — больш ніхто нічога не навязвае, не «рэкамендуе». Рабі, што хочаш, чытай і выпісвай таксама…

Трэба сказаць, што ў мяне ў той час было шмат любімых выданняў. Каб як мага раней атрымліваць іх, я стала заходзіць на пошту, забіраць сваю прэсу, а заадно, здаралася, гартаць «чужую». Вось так у рукі да мяне і трапіла «Звязда». Разгарнула, стала чытаць, як зараз помню, нешта з «праўдзівых і вясёлых гісторый», прычым настолькі нечаканых і смешных, што ў мяне адразу ж з'явілася шмат жаданняў: па-першае, даведацца, як часта такое друкуецца; па-другое, выпісаць газету сабе… А ўрэшце — вярнуцца да роднай мовы.

На ёй, беларускай, як даказала «Звязда», можна досыць цікава пісаць пра ўсё: эканоміку, палітыку, здароўе, культуру, сям'ю… На ёй жа з такой асалодай сталі чытацца апавяданні, «Казкі для дарослых», «Лініі жыцця», «Мясцовае самакіраванне»… Хутка я ўжо ведала, дзе шукаць патрэбную інфармацыю, і нават займела свайго роду любімчыкаў сярод журналістаў — гэта Валянціна Доўнар, Вольга Мядзведзева, Ларыса Цімошык, Святлана Яскевіч і Святлана Барысенка, Анатоль Кляшчук… Вельмі рада, што два гады таму ў нашай раённай бібліятэцы адбылася прэзентацыя яго цудоўнага фотаальбома «Зямля песняроў» і кнігі са звяздоўскаю «Простаю мовай» «Каб сказаць… І пачулі».

Дзякуючы «Звяздзе», пазнаёмілася са знакамітай беларускай пісьменніцай Лідзіяй Арабей…

А далей болей: у адным з нумароў прачытала інтэрв'ю са сп. Марыяй Карпенка, якая раней была рэдактарам майго любімага часопіса «Работніца і сялянка». Не вытрывала — патэлефанавала ў рэдакцыю, папрасіла нумар яе тэлефона. Марыя Іосіфаўна і сапраўды аказалася такой, якой шмат гадоў уяўлялася: вельмі мудрай, простай, шчырай… Цяпер, хай зрэдку, але мы тэлефануем адна адной. Можа, нават калі сустрэнемся…

Зрэшты, усе свае здабыткі я ўсё роўна пералічыць не змагу. Скажу хіба, што газету выпісваю адразу на паўгоддзе. І вельмі шкадую, што не рабіла гэтага раней.

**Ніна БУРКО,**

*в. Капланцы, Бярэзінскі раён.*

***Вы яшчэ паспяваеце аформіць падпіску на газету «Звязда» на IV квартал. Заставайцеся з намі — мы пішам пра тое, што сапраўды важна!***